# Адукацыйны патэнцыял коміксаў

***Існуе шмат азначэнняў комікса, аднак усе яны ў цэлым зводзяцца да таго, што комікс — гэта серыя малюнкаў, у якой расказваецца якая-небудзь гісторыя. У сучаснай педагогіцы яшчэ выкарыстоўваецца тэрмін "графічная навела" (graphic novel).***

Вучню ў яго адукацыйнай дзейнасці патрабуецца вывучыць вялікую колькасць інфармацыі, тэксту, правіл і інш. Вядома, перавесці ўсе падручнікі ў фармат комікса — не выйсце, але для замацавання пройдзенага або асабліва праблемнага матэрыялу адлюстраваць яго ў коміксе магчыма. Да таго ж коміксы спрыяюць развіццю візуальнага мыслення навучэнцаў.

Коміксы павышаюць матывацыю да вучэння, яны здольныя прыкаваць наш погляд і прымусіць прачытаць рэплікі герояў. Чытаць коміксы значна лягчэй і цікавей, чым доўгія тэксты. Чытанне і разуменне кароткіх коміксаў можа ўсяліць упэўненасць у сваіх здольнасцях, якая часам так неабходная ў працэсе навучання!

Вясёлыя карцінкі забяспечваюць візуальную падтрымку навучанню і, самае галоўнае, дазваляюць зняць напружанне, псіхалагічны заціск, які ўзнікае пры вывучэнні незнаёмага матэрыялу. Успомніце, ці добра вы разумееце і запамінаеце інфармацыю, калі напалоханы і напружаны? Коміксы настройваюць на жартаўлівы лад, дазваляюць расслабіцца — і наш мозг зноў здольны ўспрымаць інфармацыю.

Але ёсць у коміксаў і свае мінусы. Вучыцца на адных коміксах немагчыма, бо чытанне нельга абмяжоўваць толькі маляўнічымі карцінкамі, інакш мы рызыкуем зусім адвыкнуць ад больш аб'ёмных тэкстаў і кніг. Малюнкі не павінны адцягваць ад чытання. Акрамя таго, пры чытанні коміксаў могуць узнікнуць складанасці з разуменнем гумару, бо тое, што лічыцца смешным у адной краіне, можа такім не лічыцца ў іншай.

Разгледзім некалькі класіфікацый коміксаў. Н.В.Чарнова і Н.М.Макарава вылучаюць наступныя віды гістарычных коміксаў:



Легендарны пачатак Рыма. Сусветная гісторыя, 5 клас.

**2. Вывучэнне міфаў, легенд, крылатых выразаў.**

Пасля вывучэння тэмы "Дзяржава Аляксандра Македонскага" (§ 11 вучэбнага дапаможніка "Сусветная гісторыя, 5 клас") у якасці дамашняга задання вучням было прапанавана намаляваць комікс на крылаты выраз "гордзіеў вузел", "ажывіць" яго персанажа — Аляксандра Македонскага. Для прадукцыйнага выканання такога задання вучням раздаецца памятка па складанні комікса. На наступным уроку яны прадстаўляюць свае работы, на аснове іх сюжэтаў пераказваюць гісторыю стварэння крылатага выразу "гордзіеў вузел", аднакласнікі ацэньваюць выкананыя работы. Гэта спрыяе разуменню вучнямі вучэбнай інфармацыі, фарміруе ўвагу да другарадных, на першы погляд, фактаў, развівае дробную маторыку і вобразную памяць.

**4. На ўроках абагульнення.**

На ўроку абагульнення па раздзеле "Старажытны Егіпет" (сусветная гісторыя, 5 клас) з мэтай ацэнкі ведання вучнямі фактalагічнага матэрыялу ім прапаноўваецца прачытаць дыялог паміж персанажамі і пасля па ланцужку агучыць прапушчаныя гістарычныя факты. Гэта садзейнічае паўтарэнню вучнямі засвоенага матэрыялу.



Рабаўладанне ў Рыме.

з'яўляюцца заданні на ўстанаўленне правільнага ходу гістарычных падзей. У дадзеным выпадку комікс дазваляе развіваць агульнавучэбныя ўменні — лагічна структураваць веды, сінтэзаваць іх. Напрыклад, пасля вывучэння тэмы "Рабаўладанне ў Рыме" (§ 22 вучэбнага дапаможніка "Сусветная гісторыя, 5 клас") вучням прапаноўваецца разгледзець ілюстрацыі, прачытаць, пра што расказваюць удзельнікі падзей, а потым лагічна выбудаваць сюжэт комікса і выканаць заданні.

***Пытанні і заданні:***

1. Расстаўце малюнкі ў правільнай храналагічнай паслядоўнасці.
2. Пра якія падзеі вядзецца гаворка ў коміксе?
2. Ці пазналі вы персанажаў комікса? Чаму вы так думаеце? Калі гэта рэальныя фігуры, назавіце іх.
3. Што ў коміксе адпавядае рэальным фактам? Што з'яўляецца выдумкай? Чаму вы так лічыце?
4. Якія сімвалы, дэталі вы заўважылі ў коміксе? Каму яны маглі належаць? Пра што яны сведчаць?
5. Назавіце прычыны паўстання пад кіраўніцтвам Спартака?
6. Што паслужыла нагодай да паўстання?
7. Удзельнікі паўстання.
8. Вынікі паўстання.
9. Як ушанавана імя Спартака ў музыцы, жывапісе, літаратуры, кінематографе, спорце?
10. Што выпускаецца на адным з найбуйнейшых беларускіх прадпрыемстваў, якое носіць імя Спартака?

**7. Работа ў групах.**

На другім уроку па тэме "Грамадска-палітычнае становішча ў Беларусі ва ўмовах першай расійскай рэвалюцыі" (§ 20—21 вучэбнага дапаможніка "Гісторыя Беларусі, 8 клас") вучні азнаёміліся з паняццямі "Дзяржаўная Дума",

